## Падпіска-2011

**Гэтымі днямі заканчваецца падпісная кампанія на 2-е паўгоддзе 2011 года. Вельмі хацелася б спадзявацца, што яна прынясе для нас добрыя вынікі і, адпаведна, станоўчыя эмоцыі разам з цудоўным летнім настроем. Бо са свайго боку мы прыклалі максімум намаганняў, каб не толькі адстаяць пазіцыі старэйшага беларускамоўнага выдання ў вачах новых і старых падпісчыкаў, але і заваяваць новую чытацкую аўдыторыю.**

## ПАШТАЛЬЁНЫ ЕДУЦЬ ДА НАВАСЁЛАЎ

**На галоўным паштовым аддзяленні Віцебска у Рэспубліканскі дзень падпісчыка чытачоў «Звязды» чакалі сюрпрызы. Падыходзілі да стэнда, на якім была прадстаўлена «Звязда», цікавіліся коштам падпіскі, планамі рэдакцыі, чым можа здзівіць выданне. Работніцы пошты пастараліся, каб у гэты дзень падпісная кампанія прайшла як мага больш эфектыўна.**

«У «Звязды» стабільны тыраж. Вас паважаюць. Шмат падпісчыкаў у Мёрскім раёне і іншых заходніх рэгёнах Віцебшчыны. Асаблівасць сёлетняй падпіскі? Мы цяпер актыўна выязджаем у новыя мікраараёны горада да жыхароў і займаемся падпіскай. Плануем, як і летась, арганізаваць падпіску прама пад адкрытым небам падчас святкавання Дня горада Віцебска ў гістарычным цэнтры — у раёне ратушы», — расказвае «Звяздзе» Таццяна Руткіс, начальнік аддзела распаўсюджвання друку Віцебскага філіяла «Белпошта». — «Стала добрай традыцыяй у рамках падпісной кампаніі праводзіць акцыю «Рэспубліканскі дзень падпісчыка». На гэтым мерапрыемстве прадстаўнікі рэдакцый могуць сустрэцца з чытачамі, якія ўжо выпісваюць газету, знайсці новых сяброў».

Паштальён 15-га аддзялення паштовай сувязі Вера Сярогіна з радасцю павітала прадстаўніка «Звязды» на галоўным паштовым аддзяленні Віцебска — №15. «Мы з вамі сябруем ужо даўно», — гаворыць паштальён. — «Безумоўна, прыемна чалавеку не толькі падпісацца, але і пазнаёміцца з аўтарамі артыкулаў, задаць пытанні, адказы на якія хацелася б атрымаць на старонках газеты».

Мікалай НОВІКАЎ, намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» па інвестыцыях і сацыяльным развіцці:

# «ДЛЯ НАС ЗАНЯТКІ СПОРТАМ НЕ ПРОСТА ЗАХАПЛЕННЕ, А ЛАД ЖЫЦЦЯ»



**Інтэнсіўнасць сённяшніх «шэрых будняў» людзей самых розных прафесій вельмі часта звязана з наяўнасцю адмысловага здароўя і спартыўных навыкаў. Кудысьці трэба падбегчы, каб не спазніцца на сустрэчу, недзе трэба вытрымаць нагрузку шматгадзіннай сустрэчы, каб не сорамна было перад партнёрамі. Увогуле, вобраз сучаснага чалавека, які ў прыватным бізнэсе ці на дзяржаўнай службе дабіваецца пэўных поспехаў, асацыюецца з фізічна развітай асобай, дзякуючы чаму яна можа заўсёды рацыянальна думаць, заўсёды прымаць аператыўныя і правільныя рашэнні.**

**Без сумненняў, што такія меркаванні ў поўнай меры тычацца і работнікаў пошты. Бо ўжо ў лагатыпе прадпрыемства РУП «Белпошта» закладзены знак, які абагульняе сэнс усёй дзейнасці. Пацвярджэннем высокіх спартыўных амбіцый і клопатаў пра сваё здароўе можна лічыць нядаўнюю рэспубліканскую спартакіяду работнікаў паштовай сувязі краіны, якая прайшла на Магілёўшчыне.**

**Пра тое, што значаць для паштавікоў заняткі спортам і карпаратыўныя спаборніцтвы карэспандэнт «Звязды» папрасіў расказаць намесніка генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» па інвестыцыях і сацыяльным развіцці Мікалая НОВІКАВА.**

**— Мікалай Георгіевіч, трэба думаць, што спартыўны лозунг «У здаровым целе — здаровы дух» супрацоўнікам паштовай сувязі краіны вельмі блізкі?**

— Лічыце, што так. Хоць высокія спартыўныя дасягненні і выхаванне чэмпіёнаў, так бы мовіць, не наш профіль. Але ж заняткі спортам дапамагаюць нам на высокім прафесійным узроўні ўвасабляць у жыццё сваю асноўную мэту — забеспячэнне ўстойлівага эканамічнага росту, павышэнне ўзроўню дабрабыту работнікаў, безумоўнае выкананне зацверджаных мэтавых паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця.

**— Цяперашнія спаборніцтвы на базе Магілёўскага філіяла РУП «Белпошта» адрозніваліся нейкім чынам ад папярэдніх? Магчыма, барацьба сярод каманд была больш вострай, а можа, нехта змог прэтэндаваць на зорныя лаўры?**

— Скажу па-іншаму: спартакіяда паштавікоў — гэта магчымасць праверыць сябе ў нейкіх экстрэмальных умовах. Бо далёка не кожнаму па сілах адыграць у поўным фармаце футбольны альбо валейбольны матч, на поўную моц паўдзельнічаць у спартыўным мнагабор'і «Здароўе», «пагуляць» з двухпудовай гірай. Але ж час паказвае: і на летніх спартыўных спаборніцтвах, і на зімовай лыжнай спартакіядзе кожны філіял, кожнае падраздзяленне імкнецца паказаць высокія вынікі, чым пацвердзіць сваю прафесійную прыдатнасць, падтрымаць імідж не толькі свайго калектыву, але і галаўнога прадпрыемства. Таму, паверце, што мне, як члену арганізацыйнага камітэта нядаўніх стартаў на Магілёўшчыне, было прыемна ўсведамляць: на такіх мерапрыемствах ужо не знойдзеш чалавека, які прыехаў на «прыроду», каб адбыць нумар. Імкненне быць першым, стаць лідарам, выхаваць камандны дух, нягледзячы на магчымыя траўмы і сінякі, — вось аснова такіх карпаратыўных «сходаў». Таму, як бы гэта высакамерна ні гучала, для нас заняткі спортам не проста захапленне, а лад жыцця.

**Заняткі спортам дапамагаюць нам на высокім прафесійным узроўні ўвасабляць у жыццё сваю асноўную мэту — забеспячэнне ўстойлівага эканамічнага росту, павышэнне ўзроўню дабрабыту работнікаў, безумоўнае выкананне зацверджаных мэтавых паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця.**

**— Лагічна думаць, што Вам, як куратару сацыяльных пытанняў, спартыўны накірунак павінен быць добра знаёмым?**

— Не магу хваліцца пра нейкія ўласныя высокія вынікі, але ж са спортам мяне звязвае даўняя дружба. У студэнцкія гады актыўна займаўся футболам, валейболам, баскетболам, лёгкай атлетыкай, гімнастыкай. Гэтымі днямі актыўна «хварэў» за нашу моладзевую футбольную зборную, жаночую каманду па баскетболе.

Мне здаецца, што кожны чалавек павінен займаць актыўную пазіцыю ў сваім паўнацэнным фізічным развіцці і падтрымцы інтэлектуальнага ўзроўню.



# «САЮЗДРУК»: рэалізацыю гарантуем

**Супрацоўніца «Магілёўсаюздрука» Валянціна Сільчанка выйграла электрачайнік у конкурсе «Лепшаму кіяскёру — звяздоўскі прыз». Віншуем!**

## «Людзям патрэбна друкаванае слова!»

Павільён № 20 «Магілёўсаюздрука» месціцца на бойкім месцы: у самым цэнтры Магілёва, каля мэрыі і медыцынскага цэнтра. Таму змена прадаўшчыц — Валянціна Сільчанка, Анжэла Цакунова і Міла Шавырына — адказваюць на пытанні, не адыходзячы ад шматлікіх пакупнікоў. Адным тэрмінова патрэбна цікавая дзіцячая кніжка, другім — газеты, трэцім — цацкі.

Валянціна Сільчанка абслугоўвае цэлую кампанію хлопчыкаў. Малыя паведамілі, што бацькі далі ім грошы на знак добрага заканчэння вучэбнага года, і цяпер яны маюць права самастойна выбраць сабе цацкі для гульні ў «вайнушку». У выніку набылі «оптам» пісталет, двухстволку і аўтамат.

**— У нас вялікі выбар самых розных тавараў, — тлумачыць прадавец. — Але ўсё ж найбольшая ўвага надаецца продажу друкаваных перыядычных выданняў.**

Новы павільён замест звычайнага круглага кіёска адкрыўся тут 1 мая: і прадаўцы, і пакупнікі ўжо паспелі ацаніць перавагі сучаснага збудавання. Жанчыны хваляцца добрымі ўмовамі працы, людзі з задавальненнем выбіраюць і набываюць тавар.

**— Кожны чалавек можа выбраць зручны варыянт: альбо звярнуцца ў акенца і хутка атрымаць патрэбнае, альбо зайсці ў краму і самому выбіраць, што падабаецца, — гавораць жанчыны. — Адразу стала лепей прадавацца перыёдыка, бо цяпер пакупнік можа паглядзець на выданне, нават патрымаць яго ў руках, пачытаць загалоўкі і ўрэшце вырашыць, дзе найбольш актуальная для яго інфармацыя.**

Беларускую газету «Звязда», тлумачаць прадаўшчыцы, выкладаюць на першы план і імкнуцца зацікавіць пакупнікоў актуальнымі і цікавымі артыкуламі. Гэта і дазволіла вылучыцца сярод іншых у конкурсе рэспубліканскага «Саюздрука» і газеты «Звязда».

**Кожны чалавек можа выбраць зручны варыянт: альбо звярнуцца ў акенца і хутка атрымаць патрэбнае, альбо зайсці ў краму і самому выбіраць, што падабаецца.**

**— Выйгрыш у конкурсе — гэта не толькі мая асабістая заслуга, але і ўсёй нашай змены, — гаворыць Валянціна Сільчанка. — Таму будзем карыстацца падараваным чайнікам тут, на працы, усе разам.**

Сама Валянціна Якаўлеўна — вопытны работнік гандлю. Раней працавала ў харчовай краме, але пасля яе закрыцця знаёмыя параілі ёй спытацца пра працоўнае месца ў сістэме «Саюздрука». Такое месца знайшлося, і жанчына лічыць, што ёй сапраўды пашанцавала. Прынамсі, газетамі гандляваць лепей, чым харчамі: друкаваная прадукцыя даўжэй захоўваецца!» — жартуе Сільчанка.

Цяпер няпростыя часіны, але ў павільёне № 20 «Магілёўсаюздрука» ўпэўнена гавораць, што людзі знаходзяць грошы на газеты.

**— Ім патрэбна друкаванае слова! — лічыць Валянціна Якаўлеўна. — Таму нашы людзі набываюць перыядычныя выданні і чытаюць іх.**

І цяпер не столькі ім патрэбны забаўляльныя расповеды пра сенсацыі і «зорак», колькі дакладная і ўзважаная інфармацыя пра цэны, курсы і эканамічнае становішча ў краіне ўвогуле. Менавіта пра гэта найперш хочуць даведацца пакупнікі перыёдыкі.

**— Нам хацелася б пажадаць сваім калегам, журналістам і ўвогуле ўсім людзям, каб яны ашчадна ставіліся да свайго здароўя і менш хваляваліся, таму што жыццё кароткае, і хацелася б, каб яно было больш доўгім і лягчэйшым, — з такімі словамі звяртаецца праз «Звязду» Валянціна Сільчанка і яе сяброўкі па калектыве. — Заходзьце да нас у павільён, мы будзем вам вельмі рады!**

# Апошняя выязная «фотасесія» — тэлевізійная

А крокамі ў навядзенні свежых знаёмстваў і цёплых сяброўскіх сустрэч можна лічыць удзел у рэспубліканскім Дні падпісчыка, што нядаўна прайшоў па ўсёй краіне, а таксама пастаянныя выезды «ў народ» для ўручэння звяздоўцам заслужаных прызоў, якія яны выйгралі ў штоквартальнай латарэі, і навядзенні мастоў на будучыню.

Апошняя паездка ў глыбінку ладзілася на Магілёўшчыну, Гомельшчыну і Міншчыну. Пасля некалькіх дзён у дарозе мы, безумоўна, стаміліся. Але ж радавала тое, што супрацоўнікі газеты пакінулі пасля сябе добры след і пазітыўны душэўны настрой у вачах людзей, з якімі давялося сустрэцца: усё нас будзе добра!

Падчас шырокамаштабнага ваяжу па краіне мы ўручылі каляровы тэлевізар «Віцязь» нашаму даўняму падпісчыку са Жлобіна Федарцову Міхаілу Іванавічу, які ў свае 84 гады не перастае быць верным газеце і чэрпае з яе шмат цікавага для сябе. На Жлобінскім раённым вузле паштовай сувязі кампанію пенсіянеру склалі начальнік аддзела ідэалагічнай работы райвыканкама Валянціна Няхай, галоўны спецыяліст аддзела ідэалогіі Таццяна Савянкова і начальнік аддзела падпіскі Жлобінскага РВПС Тамара Аўчыннікава.



**З фірменным звяздоўскім гадзіннікам «пасябравалася» намеснік начальніка Рэчыцкага раённага вузла паштовай сувязі Таццяна Рыгораўна АРАДЖЫ.**





**Настольны гадзіннік з фірменным лагатыпам ад «Звязды» атрымала начальнік Жлобінскага РВПС Аксана СТАЛБУНОВА.**

**У папярэдніх выпусках «Кантакту» мы ўзгадалі, з чаго пачыналася гісторыя сённяшняй укладкі для моладзі «Чырвоная змена», якая раней была цэнтральным выданнем беларускага камсамола. Сёння мы друкуем успаміны намесніка рэдактара «ЧЗ» Аркадзя ТОЎСЦІКА (1953-1962 гг.).**

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

### Як «Чырвонка» змагалася са стылягамі

«...у той час «Чырвонка» змагалася са стылягамі, якія, на наш погляд, нават сваім знешнім выглядам псавалі настрой моладзі. Асабліва шчыраваў здольны журналіст, намеснік адказнага сакратара рэдакцыі Эрнст Калядэнка. Яго з'едлівыя карыкатуры на стыляг з доўгімі космамі, у абавязкова вузкіх штоніках, з цыгарэтай у зубах у розных варыяцыях змяшчаліся з нумара ў нумар. Канец гэтай бойкай тэме ў газеце паклаў не хто іншы, як... першы сакратар ЦК ВЛКСМ Шалепін сваім выступленнем на рэспубліканскім камсамольскім з'ездзе.

Гаварыў ён прыкладна так: «Гляджу я ў залу і здзіўляюся вашай знешнасці. Апранутыя вы ў большасці абы-як, быццам не хочацца быць маладым, і нават модным. — Зала прыціхла, слухае. — Асабліва хлопцы, — працягвае маскоўскі госць. — Многія ў галіфэ і ботах, гімнасцёрках ці фрэнчах, хоць вайна даўно ўжо закончылася. А калі ў касцюме, то шырыні вашых штаноў можа пазайздросціць любы матрос з любога крэйсера»... І гэтак далей, і ў такім духу. Давялося нашым мастакам шукаць іншыя тэмы для сваіх карыкатур».

### Пра журналісцкія штампы

«Неяк прыйшло пісьмо з Клецкага раёна. Выпускніца школы скардзілася на неаб'ектыўнасць у публікацыі Эдуарда Юшкевіча ў газеце. Дзяўчына ў роспачы. «З мяне смяюцца ў вёсцы і ў школе. Калі верыць газеце, то я, маўляў, толькі і мару, каб стаць даяркай. Пасля школы адразу ж бягу на ферму, — пішаце вы, — увіхаюся там, усю работу за маці раблю, вось і рукі ўсе ў мазалях».

Пры ўдакладненні ўсё аказалася больш складаным. Маці сапраўды працавала даяркай, захварэла, і дзяўчынцы давялося падмяняць яе нейкі час. Але каб застацца ў калгасе!.. Пасля школы яна будзе імкнуцца з'ехаць адсюль, падацца на вучобу ў горад, у горшым выпадку ўладкавацца ў ім на якую-небудзь работу. Спрацаваў журналісцкі штамп: «Жывёлагадоўля — ударны фронт». Дык чаму ж і гэтай дзяўчыне не пазмагацца на гэтым фронце?

Болей, здаецца, Э. Юшкевіч не памыляўся. А праз нейкі час атрымаў вучоную ступень кандыдата эканамічных навук. У лекцыях яго было шмат ад журналісцкай практыкі. Яны былі літаральна «нашпігаваны» нашымі эканамічнымі хібамі»...

Даведка слухае!

# ПАШТОВЫЯ ПЫТАННІ

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 24 мая.)*

Часам тэлефануюць людзі з нейкімі праблемамі. Бываюць і складаныя кліенты, і трэба падбіраць свае падыходы, каб пагутарыць з чалавекам, які «на ўзводзе».

— Складана на «даведачцы» працаваць, — падтрымлівае гаворку Тамара Шпілеўская, якая да таго, як за інфармацыю адказваць, спазнала ўсе тонкасці з жыцця пошты, бо працавала і паштальёнам, і кіраўніком пошты, — тут патрэбна і тактоўнасць, і стрыманасць, неабходна быць у нейкай ступені і псіхолагам. Бывае і проста адзінокія людзі тэлефануюць, якім хочацца пагаварыць, а мы разумеем, што час абмежаваны і на іншыя лініі паступаюць новыя званкі.



Часам людзі абураюцца з-за таго, што ў свой час яны не атрымалі пэўнае выданне. А ў гэтым і няма віны пошты, такія затрымкі могуць быць звязаныя, напрыклад, з працай рэдакцый, калі адтуль пэўны часопіс яшчэ не паступіў. Калі вы хвалюецеся, каб ніхто не выцягнуў выпісаныя выданні з паштовай скрыні, таксама можаце падстрахавацца — скарыстацца паслугай з рук у рукі. За невялікую дадатковую плату паштальён будзе непасрэдна ў вашу кватэру дастаўляць любое перыядычнае выданне.

На сталах у супрацоўнікаў даведкі шмат папер. Неабходную інфармацыю яны вышукваюць і праз камп'ютар. Але шмат якую інфармацыю яны трымаюць і ў галаве: напрыклад, на аўтамаце выдаюць індэксы асобных паштовых аддзяленняў ці тарыфы па паштовых адпраўленнях.

Бывае, што супрацоўнікам даведкі такое пытанне зададуць, што адказаць на яго — усё роўна, што рэбус адгадаць. Неяк пэтэлефанавала жанчына і папрасіла сказаць тэлефон пошты, якая знаходзіцца на рацэ Свіслач, назвы вуліцы жанчына не ведала.

Здавалася, за той час, што мы «аддзяжурылі» разам з даведачнай службай, былі задзейнічаны ўсе яе супрацоўнікі. То адзін тэлефон зазвініць, то другі. Але як нам патлумачылі — гэта яшчэ зацішша (час прыпаў на абедзенны перапынак), а так, асабліва зранку, супрацоўніцы адказваюць адразу на чатыры звароты і яшчэ апарат мігае — на чарзе новыя людзі з новымі пытаннямі. Асабліва актыўны народ зранку да гадзіны дня. Ну і вядома, самыя цяжкія дні выдаюцца перад святамі, асабліва навагоднімі і 8 сакавіка. Затое і святочных віншаванняў наўрад ці нехта атрымлівае больш за супрацоўнікаў даведачнай службы. І не толькі таму, што ў кліентаў настрой у такі час добры. Але і таму, што працуюць у даведцы сапраўды душэўныя, адкрытыя, шчырыя жанчыны. І дружны калектыў даведачнай службы заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу.

Працуе даведка па буднях з 9 да 20 гадзін без перапынку на абед. У суботу з 9 да 17. Нядзеля — выхадны.

# СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

## ПАДПІСКА НА 2-Е ПАЎГОДДЗЕ 2011 ГОДА

*Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)*

| Індэкс | месяц | квартал | паўгоддзе |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 14600 | 43800 | 87600 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 13400 | 40200 | 80400 |
| 63858 (ведамасны) | 24800 | 74400 | 148800 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 22200 | 66600 | 133200 |

*Падпіска «Да запатрабавання» праз кіёскі РУП «Белпошта»*

| Індэкс | месяц | квартал | паўгоддзе |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 13350 | 40050 | 80100 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 12150 | 36450 | 72900 |
| 63858 (ведамасны) | 22511 | 67533 | 135066 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 20140 | 60420 | 120840 |

*Падпіска «Да запатрабавання» праз кіёскі РУП «Белсаюздрук»*

| Індэкс | месяц | квартал | паўгоддзе |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 13250 | 39750 | 79500 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 12120 | 36360 | 72720 |
| 63858 (ведамасны) | 19591 | 58773 | 117546 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18063 | 54189 | 108378 |

*Заставайцеся з намі!*

# НАДЗЕЙНЫЯ СЯБРЫ ГАЗЕТЫ — ПАДПІСЧЫКІ

Алена КРУСЬ з Кобрына — наш шматгадовы падпісчык і сябар газеты. Шмат гадоў Алена Мікалаеўна адпрацавала на пошце. Некалькі гадоў займалася сартаваннем газет. Спрабавала выпісваць розныя выданні, але ў рэшце рэшт спыніла выбар на «Звяздзе». І ўжо два дзясяткі гадоў газета стала надзейным сябрам яе сям'і.

— У газеце падабаюцца розныя матэрыялы, але найбольш уважліва чытаю ўсё, што датычыць здароўя. Люблю парады агароднікам, і, вядома ж, матэрыялы для душы.



Надзея ЖАЛАБКОВА.

Другая наша чытачка Надзея ЖАЛАБКОВА жыве ў Жабінцы. Надзея Уладзіміраўна мае свой дом, немалую для гараджанкі гаспадарку, вырошчвае кветкі. На лета да маці прыязджаюць дзеці, унукі. Тады чытачоў у любімай газеты становіцца больш.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



Юны звяздовец Аляксей ТАБОЛІЧ.



Алена КРУСЬ.

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі: У. ЗДАНОВІЧ, І. ІВАНОВА, А. ДЗЯДЗЮЛЯ, С. ЯСКЕВІЧ, І. ЛАПАТО.

# Знакамітае «Парахонскае» збірае «талаку»:

# «РАЗАМ ЗДАБУДЗЕМ НОВУЮ СЛАВУ БЕЛАРУСКАМУ ПАЛЕССЮ!»


Такі статак і парадак цешаць вока.

### Карэспандэнты «Звязды» гутараць з дырэктарам ААТ «Парахонскае» Пінскага раёна Уладзімірам ХРАЛЕНКАМ


Зусім індустрыяльны пейзаж фотакамера «падгледзела» на адным з будаўнічых аб'ектаў.

## ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

**Уладзімір Фёдаравіч родам з Браншчыны, з Клінцоўскага раёна. Закончыў аграфак Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. Працаваў у Веткаўскім раёне Гомельскай вобласці, у саўгасе «Дружба». Пасля аварыі на ЧАЭС гаспадарка трапіла пад зону высялення. Пераехаў на радзіму жонкі, на Піншчыну, працаваў галоўным аграномам СВК «Сошненскае». У 1995 годзе ўзначаліў суседняе «Парахонскае». Як сведчыць сам Храленка, «у самы развал». І з невялікім перапынкам кіруе гаспадаркай вось ужо дванаццаць гадоў.**

**Як прызнаецца Уладзімір Фёдаравіч, некаторае пачуццё задаволенасці ад зробленага ёсць, але хацелася б, каб аддача ад працы была большай. Лічыць, што пры сённяшнім стане рынку выжыве не той, хто лічыўся самым моцным, а хто выпусціць больш танную і больш якасную прадукцыю і хутчэй «пракруціць» заробленыя сродкі.**





Напачатку Уладзімір Фёдаравіч расказвае:

— Сёння «Парахонскае» — гэта шматгаліновая гаспадарка, якая дае малако і мяса, прычым у значных аб'ёмах. А таксама зерне, насенне збожжавых і маслічных культур, шматгадовых траў. Асноўная выручка — ад жывёлагадоўчай прадукцыі. Таму фундамент нашай эканомікі — жывёлагадоўля. Раслінаводства пакуль працуе на жывёлагадоўлю — забяспечвае яе кармамі. Усё зерне, акрамя дзяржзаказу, накіроўваем на вытворчасць мяса і малака (а гэта недзе 11-12 тысяч тон у год). Зараз утрымліваем больш за 15 тысяч галоў жывёлы. Пры нашым зямельным балансе сельскагаспадарчых угоддзяў 13.846, фактычна маем больш чым адну галаву на гектар. Бал ворыва — 33, бал сельскагаспадарчых угоддзяў — трохі больш за 30. Статутны фонд ААТ салідны — прыкладна 350 мільярдаў.

Зараз у нас будуюцца альбо знаходзяцца ў стадыі рэканструкцыі 11 буйных жывёлагадоўчых комплексаў — 5 па вытворчасці малака і 6 — мяса. Сем комплексаў альбо цалкам гатовыя, альбо ў стадыі 95-працэнтнай гатоўнасці. Новых будуецца тры: два малочныя і адзін адкормачнік. Плануецца, што там паставім на адкорм 10400 быкоў.

Утрымліваем «шлейф» маладняку для ўзнаўлення статка. Агульнае пагалоўе жывёлы павінна перавысіць 25 тысяч галоў. Другой такой гаспадаркі (па аб'ёмах) у рэспубліцы пакуль няма, калі не лічыць свінагадоўчыя комплексы, гэта трохі іншае.

За апошнія тры гады мы ў сярэднім прырасталі і па пагалоўі, і па валавой прадукцыі ў 1,7—1,8 раза. Вось глядзіце: на пачатак 2010 года мелі 12 тысяч 200 галоў. Зараз, на 1 чэрвеня, 15 тысяч. Па вытворчасці валавой прадукцыі таксама расцём, і па грашовай выручцы. Прычым расцём у разы — ад 1,7 да 4-х.

**— Прабачце за пытанне: а ці вырасла за гэты час колькасць работнікаў?**

— Колькасць работнікаў за гэтыя тры гады павялічылася толькі ў 1,2 раза. Зараз у нас працуе 570 чалавек. Трактарыстаў і наогул механізатараў —140, яшчэ больш жывёлаводаў — 160, спецыялістаў больш за 70. Сярэдні ўзрост працуючых — 45 гадоў.

Вельмі вялікая нагрузка на жывёлаводаў: кожны ў сярэднім абслугоўвае ад 400 да 600 галоў жывёлы. Маю на ўвазе перш за ўсё буйную рагатую жывёлу, жывёлу на адкорме, а для маладняку свае нормы — ад 50 да 100, бо патрэбен больш дбайны догляд.

Практычна ўсе працэсы механізаваныя, у жывёлагадоўлі таксама. Ручная праца засталася толькі там, дзе нельга без рук.

**— Вы ў асноўным працуеце на ўласных кармах...**

— Гэта стала магчымым дзякуючы таму, што за апошні час многае зроблена і ў раслінаводстве. За тры гады перазалужылі практычна ўсе травы і працягваем перазалужванне зараз. Абмянялі гатункі збожжавых культур. Вельмі многа ўносім мінеральных угнаенняў — пад поўную патрэбу культур, пад ураджай за 50 цэнтнераў з гектара, і, у прынцыпе, гатовы атрымліваць такі ўраджай. Няхай гэта банальна гучыць, але падводзяць умовы надвор'я. З красавіка на тэрыторыі гаспадаркі выпала толькі пяць працэнтаў асадкаў — ад нормы. З 24 красавіка па сённяшні дзень толькі ў мінулую суботу прайшоў невялікі дождж. Калі вы ехалі да нас, то каля знака «Парахонск» маглі бачыць белае жытнёвае поле, а ў многіх месцах — траву, якая выгарала на сонцы. Тэмпературы былі крытычнымі і для апылення збожжавых.

Нам пашанцавала ў тым сэнсе, што па тэрыторыі гаспадаркі праходзіць рака Бобрык. Мы яе фактычна перакрылі, і праз сістэму каналаў і шлюзаў, пабудаваных меліяратарамі з нашым удзелам, падаём ваду з ракі на палі. Стараемся вельмі ашчадна і прадумана карыстацца вялікім дарам прыроды і вынікам працы рук чалавека, каб ніводная кропля такой патрэбнай зараз вільгаці не прапала дарэмна. Уся рака Бобрык перацякае ў нашы каналы і «знікае» ў іх — такая вялікая патрэба ўсяго жывога ў вільгаці. І ў гэтай часткова прыроднай, часткова рукатворнай гідрасістэме — наш паратунак. Дзякуючы таму, што ёсць магчымасць «напаіць» палі, мы ў значнай ступені змаглі захаваць ураджай. Хоць пры нарыхтоўцы сенажу ўзялі яго значна менш, чым летась. Травы ўсе скошаны, але ўраджайнасць была меншая. Што датычыць другога ўкосу, то выкананы комплекс мерапрыемстваў, унесены ўгнаенні, чакаем дажджу. Спадзяёмся, што ўсё будзе: і дождж, і другі ўкос. Звычайна здымаем тры ўкосы.

Для нас даждлівае надвор'е лепш, чым суш, яшчэ і таму, што шмат тарфянікаў. А торф пераграваецца, і калі тэмпература паветра 32, то на тарфяніку тэмпература паверхні, дзе расце расліна, 58. Яйка можа зварыцца...

Але і ў гэтых няпростых умовах мы — з кармамі, і ў дзень даём 45 тон малака.

**— У 2009 годзе вы лідзіравалі ў раёне па малацэ, па мясе і валавым зборы збожжавых. Гэтыя пазіцыі засталіся?**

— Яны застануцца і на наступны год, і вынікі будуць нарошчвацца. Аб'ёмы вельмі сур'ёзныя, многа закупляем жывёлы. У заатэхнікаў ёсць магчымасць выбраць тую, якая дасць высокую прадукцыйнасць. У тым ліку (і перш за ўсё) па малацэ. Каб папаўненне статка было якасным.


Сучасная даільная зала.

**— А гэта ўжо адбор, нават селекцыя. Такім чынам, прывагі, надоі — у многім і за кошт комплекснай селекцыйнай работы?**

— Безумоўна. Працуюць тры фактары: фактар селекцыйнай работы, фактар тэхналогіі і фактар кармоў (у тым ліку спецыяльных, больш канцэнтраваных, калі размова ідзе аб адкорме). Шырокай аўдыторыі чытачоў, магчыма, нашы чыста прафесійныя тонкасці не патрэбныя. Скажу толькі, што ўсе гэтыя «тры кіты» грунтуюцца на моцным навуковым фундаменце і не менш грунтоўнай практыцы, праверанай жыццём. Нават тое, што тысячы бычкоў і кароў утрымліваюцца на нашых комплексах без рагоў і хвастоў, таксама ад жыцця, ад практыкі. Так для іх саміх больш бяспечна, не траўматычна. Згадзіцеся, што бугай вагою ў паўтоны з вострымі рагамі — гэта сур'ёзная машына. Альбо такая задачка: як жывёлу не перакарміць пры дастатку кармоў, каб не набрала лішняга тлушчу, бо для дойнага статка гэта непатрэбна. Як наогул збалансаваць кармы па патрэбных жывому арганізму мікраэлементах, каб пастаянна здаваць адкормачнікаў высокімі кандыцыямі — усё гэта, і не толькі гэта, з'яўляецца паўсядзённым клопатам нашых спецыялістаў.

З пачатку года пагалоўе прырасло амаль на 4 тысячы, прырост надояў малака склаў 186 працэнтаў да ўзроўню мінулага года, таварнасць прырасла на 3,6 працэнта і дасягнула паказчыка 85,5. Гатункам «экстра» летась здавалі 22 працэнты, сёлета выйшлі на 87 (ацаніце, які рывок!), а апошнія тры месяцы наогул набліжаемся да ста працэнтаў. Валавыя сярэднясутачныя прывагі буйной рагатай жывёлы павялічыліся амаль у два разы — па гаспадарцы 772 грамы. Бычкі на адкорме даюць сярэднясутачныя прывагі 1 кг 39 грамаў. І бачым, што для нас гэта яшчэ не мяжа.

Што датычыць рэнтабельнасці, то ў цэлым па гаспадарцы яна складае 13,6 працэнта, малако мае рэнтабельнасць 36, да 40 працэнтаў. Рэнтабельнасцю па мясе пахваліцца пакуль не можам, але з уводам новых комплексаў тут таксама выйдзем на нармальныя пазіцыі.

**— Цяпер — пра новыя комплексы. Каму вы даверылі сваю «будоўлю веку»?**

— У нас на падрадзе працуюць адразу некалькі перасоўных механізаваных калон «Пінсксаўгасбуда», яны запрасілі на субпадрад спецыялізаваныя будаўнічыя, мантажныя, аддзелачныя і іншыя ўпраўленні. Працуе ледзьве не ўся рэспубліка. Сёлета наша ўсенародная будоўля павінна быць завершана, застанецца адна малочнатаварная ферма. Калі дарожнікі (нашы комплексы — на балоце, для пад'езду да іх патрэбны дарогі) ад нас не пяройдуць на аб'екты, вызначаныя ім мэтавымі праграмамі, то магчыма, што сёлета будзе завершана і яна, застанецца толькі добраўпарадкаванне.

Адначасова з чыста вытворчым будаўніцтвам вядзём і будаўніцтва жылля для сваіх работнікаў, бо нам вельмі патрэбны кадры. Сёлета здалі 30 домікаў сядзібнага тыпу, і зараз будуецца 48 кватэр у двух дамах — у верасні будзе вялікае наваселле.

Як бачыце, мы не проста дэкларыруем, што ў сувязі з пашырэннем вытворчасці маем патрэбу ў працоўных рэсурсах, а рыхтуем матэрыяльную базу для далейшага росту калектыву.

**— Просты падлік паказвае, што адных жывёлаводаў вам хутка спатрэбіцца яшчэ чалавек 40...**

— Нават 50. Жыллё мы прадастаўляем. У дадатак да традыцыйных пад'ёмных аказваецца такая вось разавая дапамога чалавеку — выдзяляецца сучасная кватэра цаной у 250 мільёнаў рублёў. Жыві і працуй, тым больш, што сярэднямесячная заработная плата таксама дастойная — 1 мільён 300 тысяч рублёў. Для сельскай мясцовасці, дзе многія трымаюць сваю гаспадарку, гэта не малы заробак. А механізатары і жывёлаводы ў нас наогул высокааплатная катэгорыя. Механізатар і вадзіцель могуць зарабіць ад двух да трох мільёнаў — толькі не лянуйся.

Выплачваем трынаццатую зарплату, і палову акладу выдаём «зверху», калі чалавек ідзе ў адпачынак. Каб людзі маглі аздаравіцца. Існуе таксама натуральная аплата, пакуль у выглядзе збожжа, бо частка насельніцтва трымае дамашнюю гаспадарку. Праўда, з ростам заработнай платы наглядаецца скарачэнне колькасці дамашняй жывёлы. Па малако ходзяць у вясковы магазін ці на ферму (можна выпісваць). І гэта пры тым, што мы дапамагаем людзям трымаць гаспадарку. Напрыклад, ніхто даўно не косіць сена свойскай жывёле. Сена прывязуць у двор і складуць у стажок, салому і збожжа прывязуць таксама. Як у гэтым годзе не было складана з кармамі, а мы ўжо на 80 працэнтаў забяспечылі людзей сенам — з траў першага ўкосу. Пасля ўборкі атрымаюць і збожжа.

І стараемся падтрымліваць маладыя сем'і, асабліва тыя, дзе шмат дзяцей.

**— Такая вялікая будаўнічая праграма вас моцна напружвае, у сэнсе фінансаў?**

— Патрэбна сказаць вялікі дзякуй кіраўніцтву Нацыянальнага банка краіны, у структуру аднаго з прадпрыемстваў якога — агракамбіната «Мачулішчы» — мы былі ўключаны ў 2008 годзе. Пад усе нашы даволі грандыёзныя задумкі нам выдзяляліся патрэбныя сродкі ў выглядзе крэдытаў, якія і сталі «рухаючай сілай».

Пад эгідай Нацыянальнага банка, роля якога ў нашым рыўку — велізарная, праводзіліся і праводзяцца кансультацыі па напрамках развіцця гаспадаркі. Дзякуючы яго падтрымцы маем магчымасць пераймаць і прымяняць у сябе перадавыя, самыя найноўшыя тэхналогіі, якія толькі ёсць у краіне. І мы валодаем поўнай інфармацыяй па гэтых тэхналогіях, па эфектыўнасці гаспадарання аднатыпных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

У выніку ўмацоўваецца наша эканоміка, мы вядзём вялікае будаўніцтва. Павялічылася колькасць рабочых месцаў. Работнікі забяспечаны ўтульнымі бытавымі памяшканнямі. Жывёлагадоўчыя комплексы і фермы адказваюць сучасным тэхналагічным патрабаванням.

Грошы, якія ўкладзены ў наша развіццё, мы абавязкова адпрацуем, і гэта пойдзе на карысць усяго рэгіёна, на карысць народа.


Маленькім цялятам тут будзе ўтульна.


Жывёлаводы Ганна РАМАНОВІЧ, Ніна САВІЛА, Ганна ГАРДЗІЕВІЧ і загадчыца Еўдакія МАЦКЕВІЧ (другая злева) працуюць на комплексе «Селішча».


Будуецца новы жывёлагадоўчы комплекс.

## Не баліць галава ў халасцяка...

**Слова намесніку дырэктара па ідэалогіі Ларысе ТРАФІМАВАЙ.**

— У выхаваўчай, інфармацыйнай рабоце ў калектыве на першы план выходзіць асабісты кантакт з людзьмі. На фермах, у полі, на ўсіх вытворчых участках. З механізатарамі сустракаемся фактычна штодзённа. Калі ёсць асабісты кантакт кіраўнікоў усіх узроўняў з работнікамі — калектыў будзе інфармаваны своечасова і правільна. Пры такіх сустрэчах вырашаюцца не толькі актуальныя вытворчыя пытанні, але і асабістага характару, бо хадзіць на прыём да кіраўніцтва людзям абсалютна няма часу. Тлумачым таксама палітычную і эканамічную сітуацыю ў краіне.

У нашым акцыянерным таварыстве працуюць 72 спецыялісты, у асноўным — з вышэйшай адукацыяй. Значыць, людзі markdownрознабакова падрыхтаваныя. Таму адзін з рэзерваў для сябе бачым у тым, каб лепш выкарыстоўваць іх патэнцыял і ў дзейнасці інфармацыйна-прапагандысцкіх груп, наогул у выхаваўчай рабоце. Інтэлігент у вёсцы — гэта ўсё ж больш, чым проста інжынер, ветурач, аграном. Як і сельскі настаўнік, ён павінен быць прыкладам для жыхароў вёскі. Тым больш, што за апошнія дзесяцігоддзі вырас агульнаадукацыйны ўзровень усяго народа, працаваць з людзьмі стала і прасцей, і складаней. Складаней хоць бы таму, што яны павінны ведаць не толькі свае правы, але і абавязкі.

...Часцей за ўсё людзі звяртаюцца да кіраўніцтва па бытавых праблемах. Стараемся дапамагчы — гаспадарка мае нядрэнныя магчымасці, каб падтрымаць сваіх работнікаў, сацыяльны пакет даволі значны. Напрыклад, аказваем дапамогу пры ўступленні ў шлюб, нараджэнні дзяцей, у нейкіх іншых выпадках.

Адна з важных састаўных частак нашага сацыяльнага пакета — прадастаўленне жылля ўсім, хто мае ў ім патрэбу. Жыллём стараемся забяспечыць і новае папаўненне. Чарга на новыя кватэры ў нас невялікая, усяго 20 чалавек. У асноўным гэта несямейная моладзь: калі нашы халасцякі даведаліся, што будуюцца два 24-кватэрныя дамы, то дружна падалі заявы. А пакуль новыя дамы будуць здадзены, набылі для іх пяць добраўпарадкаваных кватэр, зрабілі там рамонт і селім моладзь як у інтэрнат. Калі гэта трохпакаёвая кватэра, селім трох хлопцаў — кожнаму па пакоі.

Калектыў бачыць, што ў гаспадарцы пра людзей турбуюцца. Няма параўнання з тым, як дзясятак гадоў таму жанчыны даілі кароў — адмярзалі рукі. А як яны дояць зараз? У цяпле, ва ўтульнай даільнай зале, з дапамогай аўтаматыкі. Ёсць і цёплая бытоўка, дзе можна пераапрануцца, і цёплая вада, душ і г.д.

У нас даволі развітая сацыяльная сфера. Маем свой гандаль — гандлёвы цэнтр: два магазіны, сталовая, кавярнябар. А таксама гасцініцу, службу жыллёва-камунальнай гаспадаркі, бальніцу. Акрамя агульнаадукацыйнай, працуюць музычная і спартыўная школы.

Прыдае аптымізму той факт, што ў вёсках на тэрыторыі гаспадаркі многа дзяцей. 120 малых наведваюць дзіцячы садок, і бацькі могуць спакойна працаваць. Яшчэ 360 вучацца ў школе. Гэта — наш заўтрашні дзень. Нас радуе, калі выпускнікі школы вяртаюцца дадому пасля пошукаў свайго месца ў жыцці. Нядаўна вярнуўся хлопец ужо сталы, гадоў 25-ці, які раней працаваў у нас механізатарам, а потым паехаў у вялікі горад. Калі захацеў вярнуцца, то крыху саромеўся зайсці да дырэктара, каб папрасіцца назад. Прыйшоў да высновы: «Дома лепш». Мы яму паверылі і зноў прынялі на працу.

## Ёсць перспектыва ў жыцці

**Галоўны бухгалтар Галіна Рыгораўна ДУБІНА:**

— Некалі па ўсёй вялікай краіне ведалі саўгас «Парахонскі». Потым адзін час у гаспадарцы наглядаўся спад. А зараз, я думаю, усё зноў пойдзе як мае быць. Жаданне працаваць у людзей ёсць, станоўчая дынаміка ў выніках гаспадарання таксама ёсць, летась ужо пайшоў адчувальны прыбытак ад рэалізацыі нашай прадукцыі. У нас усё ёсць: тэхніка, жывёлагадоўчыя комплексы, жывёла, перадавыя тэхналогіі, умелыя кадры. Адзінае, што нам патрэбна, — «падпітка» людзьмі. Бо пры тым вялікім размаху, які намеціўся ў нашай гаспадарцы, людзей патрэбна многа. Працавітых, талковых, умелых, ці ва ўсякім разе, ахвотных навучыцца. А настаўнікі ў нас свае.

Прыемна, што ўсё часцей застаецца дома наша моладзь, у яе ёсць настрой працаваць. У тым ліку цялятніцай, даяркай, механізатарам. У мяне сын хутка заканчвае школу, то ўжо зараз заяўляе: застануся тут. Маладыя бачаць, што і дома ёсць перспектыва ў жыцці, у будучай прафесіі. І садок, і школа, і камунальная служба, і магчымасць атрымліваць годную аплату за сваю працу.

Удакладняем:

— Галіна Рыгораўна, колькі вы грошай плаціце за новую тэхніку?

— Сродкі трацяцца значныя. У зусім недалёкім 2009 годзе на тэхнічнае пераўзбраенне мы накіравалі 17,5 мільярда рублёў. І адразу гаспадарка ажыла. Да гэтага былі трактары па 30—35 гадоў «выслугі», за руль страшна было садзіцца. За 2010 год уведзена ў эксплуатацыю асноўных сродкаў на 135 мільярдаў. Гэта і будаўніцтва, і новая тэхніка. Летась


Трактарыст Віталій ТОКАР з кагорты маладых механізатараў.


На глебах з павышанай вільготнасцю працуе спецыяльная тэхніка, якая не наносіць шкоды пасевам. На заднім плане – тыя самыя каналы, якія ў засушлівы час ратуюць ураджай.


У ветурача Карыны ГАЛУШКІ працоўная біяграфія толькі пачынаецца.


За меліярацыйнымі каналамі патрэбен догляд.

атрымалі з «Гомсельмаша» адразу 15 камбайнаў агульным коштам 8,5 мільярда. З вытворцамі іх мы ўжо разлічыліся. Так што за апошнія тры гады толькі на тэхніку пайшло каля 50 мільярдаў. На запчасткі з улікам гумы ў год ідзе 1 мільярд 300 тысяч. Наогул, запасныя часткі на імпартную тэхніку вельмі дарагія, таму бяром курс на тэхніку айчыннай вытворчасці.

Калі спачатку разлічваліся крэдытамі, то сёння — сродкамі ад вяртання падатку на дабаўленую вартасць. Сёння няма запазычанасці ні па бюджэтных пазыках, ні па крэдытах банкаў.

## Кузняй кадраў стала вясковая школа

**Расказвае галоўны інжынер Аляксандр ТРАФІМАЎ:**

— Тэхнікі ў гаспадарцы шмат, толькі ў аўтапарку 125 машын. У тым ліку 26 аўтасамазвалаў-«цяжкавагавікоў» «МАЗ». Яны актыўна ўдзельнічаюць у нарыхтоўцы кармоў, забяспечваюць бесперапынную работу трох кормаздабываючых комплексаў.

Трактарны парк налічвае 123 адзінкі. І больш за 500 прычапных агрэгатаў. У той жа час, напрыклад, трактарыстаў — 86 чалавек. Як бачыце, людзей не хапае. Добра, што ўзялі дзесяць энерганасычаных трактароў, у тым ліку амерыканскі «Джон Дзір». І можна сказаць, што яны нам забяспечылі тры апошнія пасяўныя кампаніі, іншую тэхніку прыцягвалі мала.

У той сітуацыі, што нестае механізатараў, асноўнай іх кузняй стала навіцца мясцовая сярэдняя школа. Па ініцыятыве акцыянернага таварыства там уведзена профільнае навучанне, мы перадалі ім трактар МТЗ-82 у нармальным стане. У выніку атрымліваем папаўненне. Сёлета да нас прыйшло адразу дзевяць выпускнікоў 2011-га года. Нехта з іх жадае вучыцца далей — гэта цудоўна. Нам кадры вышэйшай кваліфікацыі таксама патрэбны. Хлопцы пойдуць у армію, але ўсё роўна, лічым, да нас вернуцца, бо далёка не ўсюды ёсць такія ўмовы для працы і наогул жыцця.

Праз некаторы час, калі «набягае» год стажу, наша моладзь з катэгорыяй «А» праходзіць перападрыхтоўку ў Пінскім каледжы, здае на іншыя катэгорыі і атрымлівае правы працаваць на шырокім спектры тэхнікі. А яе ў нас — на любы густ.

У жывёлагадоўчай галіне за эфектыўнай работай абсталявання сочаць інжынер па працаёмістых працэсах Аляксандр Ванін, ёсць інжынер па вадзе і каналізацыі Віктар Дабярчук. Працуе інжынер-электроншчык, выпускнік РТІ Павел Кравец. У яго дзесяць гадоў стажу ў Мінску, але вярнуўся Павел Паўлавіч на «малую радзіму», дзе яго веды вельмі запатрабаваныя. Такі вось прыклад: з мэтай эканоміі паліва і большага кантролю за яго расходам ставім на тэхніку сістэму GPS. На дваццаці машынах ужо паставілі, на дваццаці зараз ставім, а ўсяго яны будуць стаяць на ста. З іх дапамогай перамяшчэнне тэхнікі кантралюе спадарожнік, і ў кожную хвіліну можна бачыць на экране прыбора, дзе зараз яна знаходзіцца.

Я нядаўна аналізаваў: з дзесяці інжынераў восем — з вышэйшай адукацыяй, заканчвалі дзённы стацыянар. Усе маладыя, да 30 гадоў. Спачатку прыйшлі на адпрацоўку пасля інстытута, потым ім спадабалася і — засталіся. Ад дабра дабра не шукаюць, бо не так проста знайсці цікавую і высокааплатную работу.

І ўсё ж галоўнай праблемай для нас застаецца недахоп механізатарскіх кадраў. Нам бы яшчэ чалавек 30 талковых хлопцаў! Мы гатовы ўжо сёння прыняць на работу механізатараў і пасадзіць на высокапрадукцыйную тэхніку. Што само па сабе гарантуе высокія заробкі. Плюс сацыяльны пакет.

## Поіць палі Бобрык

**Гаворыць галоўны аграном Аляксандр ПІКУН:**

— Пры ўсёй шматпрофільнасці нашай гаспадаркі існуе цесная тэхналагічная ўзаемасувязь паміж галінамі, і ў першую чаргу паміж жывёлагадоўляй і раслінаводствам. Ставіцца задача надзейна падтрымліваць свой жывёлагадоўчы цэх уласнымі кармамі, таму стаўка — на іх якасць. Бесперабойна і эфектыўна павінен працаваць зялёны канвеер. Загадзя распрацоўваецца план: колькі садзім кукурузы, бабовых, колькі будзе сенажу, зялёнай масы і г.д. Каб не купляць бялкі, садзім на сотнях гектараў гарох, сою, канюшыну ў чыстым выглядзе, рапс... Пасяўная прайшла ў тэхналагічна абумоўленыя тэрміны, але была складаная. Зімой глеба прамерзла па нізінных месцах настолькі, што вясной вельмі доўга адтайвала, не маглі зайсці з тэхнікай, рыхтавалі выбарачна, паступова. Атрымлівалася так: на высокіх месцах глеба перасыхае, а ў нізінах культыватар выварочвае прыхоплены лядком торф. На 311 гектарах давялося перасеяць азімыя.

Ураджайнасць паднялі дзякуючы яшчэ і таму, што пачалі больш уносіць азоту, фосфару і калію. Ёсць некалькі палёў з высокім балам раллі, там збіраем высокія ўраджаі ячменю — 70 цэнтнераў з гектара. Але задача стаіць дабівацца нармальнага ўраджаю і на астатніх, нават калі там бал раллі да 15-ці. У нас дзякуючы новаму этапу меліярацыі сёлета дабавіцца 2600 гектараў. Але бальнасць зямлі вельмі нізкая.Так што каб іх эфектыўна асвойваць, давядзецца ўкладваць сродкі, прычым спатрэбіцца шмат арганікі. Пакуль сеем там аднагадовыя.

Адзін са складальнікаў нашай спецыялізацыі ў раслінаводстве — сяўба шматгадовых траў на насенне. Прычым у гэтым годзе мы пасеялі на тысячы гектараў. Цэлы набор траў, і сярод іх на доследным полі такія семяннікі, якіх пакуль ні ў каго ў Беларусі няма.

Што датычыць збожжавых, то штогод высяваем іх толькі першай рэпрадукцыяй, і не менш за 30 працэнтаў — элітай збожжавых культур. І дапамагаем раёну насеннем высокіх рэпрадукцый.

У службе галоўнага агранома — аграхімік і насеннявод. Летась да нас прыйшлі выпускнікі, муж і жонка, Надзея і Аляксандр Яўсеенкі. Ім і даверылі гэтыя адказныя ўчасткі. А яшчэ патрэбен (студэнты, увага!) аграном-лугавод, бо будуецца лінія па ачыстцы насення шматгадовых траў, будзем прадаваць іх эліту і суперэліту на экспарт. Патрэбен аграном-меліяратар, бо меліярацыйная сетка вялікая, важна своечасова абслугоўваць.

Сёння на тэрыторыі гаспадаркі пройдзе семінар меліяратараў: паслухаем людзей, нешта раскажам і пакажам самі, абмяркуем надзённыя пытанні.

## Добрым людзям рады будзем!

**Галоўны заатэхнік Мікалай БАНЦЭВІЧ:**

— Пачну з простай, здавалася б, лічбы, але за ёю стаіць наша, скажам так, стратэгія. Сёлета закуплена 2942 галавы маладняку, у тым ліку ў насельніцтва — 1420 цялушак. Шмат і свайго маладняку, а гэта надзейнае «папаўненне».

Атрыманне добрага маладняку лічым першачарговай задачай, каб стварыць высокаэфектыўнае матачнае пагалоўе. У прыватнасці, буйной рагатай жывёлы, тых жа кароў, якіх у нас сёння тры тысячы. З уводам сёлета ў строй дзейных яшчэ аднаго комплексу пагалоўе кароў будзе даведзена да 3500 галоў. А праз год у нас павінна быць ужо 5 тысяч кароў. Такая вось дынаміка.

Плюс 360 галоў мясной пароды. Зараз дзейнічаюць тры малочнатаварныя комплексы, абсталяваныя сучаснымі даільнымі ўстаноўкамі. Аператары машыннага даення працуюць пазменна, як на заводзе, усе працэсы механізаваныя. У племяннной рабоце выкарыстоўваем канадскі матэрыял — высокапрадукцыйнае семя. Дзякуючы прымяненню так званага аднаполага семя дабіваемся 95 працэнтаў выхаду цёлачак. А не 50 на 50 — цёлачкі і бычкі, як звычайна.

І малочная, і мясная жывёлагадоўля пастаўлены на прамысловую аснову. Кармамі жывёла забяспечана: летась нарыхтавалі іх з паўтарагадовым запасам. А вось гэтая зона, якая трапіла зараз пад меліярацыю, дазволіць нам яшчэ больш пашырыць кармавую базу.

Вядома ж, кормім не толькі леташнім сенажом, плюшчанай кукурузай ці сіласам. Адной толькі сакавітай цімафееўкі штодня ідзе на падкормку жывёлы 150 тон. Камбікармы таксама ўласныя, высокай якасці — працуюць дзве лініі (а ў бліжэйшай перспектыве будаўніцтва яшчэ аднаго цэха па вытворчасці камбікармоў). Рыхтуем іх самі, шасці відаў — для розных груп жывёлы, з прэміксамі і іншымі неабходнымі кампанентамі. Вось чаму за пяць месяцаў надаілі на карову дзве тысячы 149 кілаграмаў, да ўзроўню мінулага года гэта плюс 186 кілаграмаў. План — надаіць на карову 5200. Мы штогод гэты план выконваем і ўздымаем «планку» ўверх.

На адкорме маем па годзе сярэднясутачную прывагу 951 грам, задача стаіць выйсці на кілаграм. За май месяц так і ёсць — кілаграм. Калі замацуемся на гэтым паказчыку, наступная задача — кіло дзвесце.

Утрыманне жывёлы бяспрывязнае, яна мае магчымасць свабодна выходзіць з памяшкання на дворык. У прасторных памяшканнях — светла, чыста, хапае паветра, а гэта важна. Калі не будзе хапаць паветра, не будзе прадукцыі. На кароўніках у кожнай каровы свой бокс, да якога яна «прыпісана» пастаянна, прывыкла і дзе адчувае сябе камфортна. Напрыклад, на МТК-1 у 120 боксах утрымліваецца 120 жывёл. Гэта патрэбна яшчэ і з пункту гледжання бяспекі ад перадачы захворванняў.

У нас свая тэхналогія догляду і выходжвання цялятак, якія толькі нарадзіліся, свая рэцэптура іх кармлення. Свая тэхналогія і вырошчвання цялушак. Сярэднясутачная іх прывага — 700 грамаў. Цёлкі пакрываюцца ў 14 месяцаў пры жывой вазе 360 — 380 кілаграмаў. І ў два гады мы атрымліваем пародзістую карову.

Сярэдняздатачная вага быкоў — 422 кілаграмы. Жывёла ідзе ў асноўным вышэйшай укормленасцю. Дзяржаве за пяць месяцаў прадалі 783 тоны.

На дзейных комплексах кадрамі мы забяспечаны, аператараў машыннага даення хапае, людзі працуюць з выхаднымі. А вось на тыя комплексы, якія будуюцца, будзем набіраць жывёлаводаў. Ужо ёсць тэлефонныя званкі, хутка пачнём камплектаваць калектывы. На кожным комплексе будуць начальнік, памочнік, селекцыянер, асеменатар і два ветэрынарныя ўрачы. І, зразумела, жывёлаводы. Так што калі ёсць ахвотныя папрацаваць у «хлебным» месцы (а яшчэ ў грыбным, ягадным, агурочным) — на маляўнічай Піншчыне, то запрашаем. Добрым людзям рады будзем.


Адно з новых памяшканняў, дзе ўтрымліваецца статак.


Начальнік жывёлагадоўчага комплексу Васіль ЧЫМБУР (першы справа), даглядчыкі Уладзімір ЛЯЎША і Мікалай ЗЕЛЬМАН.



За работу «малочнага таксі» адказвае Сяргей ГРЫШКО.

Рэпартаж з колаў

# «ЁСЦЬ ШТО ПАГЛЯДЗЕЦЬ І НАД ЧЫМ ПРАЦАВАЦЬ, КАБ АТРЫМЛІВАЦЬ ВЫНІК»



Сённяшнія школьнікі – заўтрашні дзень «Парахонскага».



Памятная дошка нагадвае пра падзеі векавой даўніны.


Наведвальнікаў гасцініцы сустракае адміністратар Ганна ГАРКОВІЧ.

Пасля двухгадзіннай гутаркі ў дырэктарскім кабінеце (і такой жа па працягласці размовы з намеснікам па ідэалогіі і галоўнымі спецыялістамі) Уладзімір Фёдаравіч павёз нас знаёміцца з гаспадаркай. Па дарозе ўвесь час расказваў, паказваў, каментаваў, і з гэтага вялікага патоку інфармацыі складвалася мазаіка вельмі напружанага жыцця гаспадаркі, кіраўнікі і калектыў якой ведаюць, чаго хочуць, і ўмеюць дабівацца пастаўленай мэты.

— Дзякаваць Богу, мы са сваёй грандыёзнай будаўнічай праграмай паспелі своечасова, — кажа дырэктар. — Калі б давялося пачынаць будаўніцтва зараз, то не зрабілі б і палову, настолькі на ўсё выраслі цэны. Фактар часу сыграў нам на руку. Тое, што пабудавана, адсюль нікуды не дзенецца, яно будзе працаваць на эканоміку, на гэты рэгіён дзесяцігоддзі.

Свае комплексы будуем з такім разлікам, каб побач была дастатковая кармавая база, куды можна вывозіць і арганіку. Сёння мы ў стане нарыхтаваць за дзень 1000 — 1200 тон сенажу высокай якасці. Тады як раней гэта было 200 — 300 тон.

Каб вы лепш зразумелі размах будаўніцтва на тэрыторыі гаспадаркі, назаву такую лічбу: штодзённа на шматлікіх аб'ектах укладваецца 500 тон бетону. Будуем не толькі буйныя жывёлагадоўчыя комплексы, але і збожжасушыльны комплекс, склад мінеральных угнаенняў і шмат чаго іншага, — пабачыце на свае вочы. У тым ліку заканчваем і рэканструкцыю вось гэтага мехдвара, на якім мы зараз знаходзімся.

У нас два мехдвары з рамонтнай базай, для якой мы набылі металаапрацоўчыя станкі на палову мільярда, і сёлета яшчэ на мільярд узялі іншага абсталявання — стэнды, варштаты... Фактычна цалкам абнавілі рамзону.

На тэрыторыі гэтага мехдвара — парк спецыяльнай тэхнікі, аўтапарк, гаражы МТЗ... Тэхніку куплялі як за ўласныя сродкі, так і бралі крэдыты. У выніку практычна ўсе тэхналагічныя працэсы ў гаспадарцы механізаваныя.

Праязджаем побач з гіганцкімі серабрыстымі ёмістасцямі.

